Пролетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 291 (360) ЧАЦВЕР 19 СНЕЖНЯ 1940 г.

Цана 10 капеек.

ЗАМАЦАВАЦЬ ПОСПЕХІ АГІТАЦЫЙНА-МАСАВАЙ РАБОТЫ СЯРОД НАСЕЛЬНІЦТВА

15 снежня на выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных перамог вялікі сталінскі блок комуністаў і беспартыйных. Усюды ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных выбраны сапраўдныя сыны і дочкі народа, лепшыя стаханаўцы прадпрыемстваў і калгасаў, прадстаўнікі інтэлігенцыі і працоўных сялян-аднаасобнікаў.

У нашай вобласці выбары прайшлі арганізавана; амаль 100 процантаў выбаршчыкаў удзельнічала ў галасаванні. Рабочыя і сяляне ішлі на выбарчыя ўчасткі з сцягамі, спявалі песні. Дзень выбараў з'явіўся вялікім усенародным святам працоўных.

Гэта вялікая перамога на выбарах дасягнута таму, што партыйныя арганізацыі вобласці праявілі сваю арганізуючую і кіруючую ролю ў выбарчай кампаніі, шырока разгарнулі агітацыйна-масавую работу сярод насельніцтва.

Ва ўсіх гарадах і раёнах нашай вобласці ў перыяд выбарчай кампаніі былі арганізаваны і працавалі сотні гурткоў, у якіх займаліся тысячы людзей. Да вядзення агітацыйнай работы партыйныя арганізацыі змаглі прыцягнуць тысячы перадавых актывістаў з рабочых і сялян, кадры совецкай інтэлігенцыі. Гэтыя актывісты на практычнай рабоце апраўдалі вялікае давер'е, аказанае ім, і пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый падрыхтавалі вялікую перамогу. Яны чэсна і аддана працавалі на выбарчых участках, у дамах выбаршчыкаў, праводзілі індывідуальныя гутаркі. У пераважнай большасці агітацыя вялася на роднай мове выбаршчыкаў. У Гродне на польскай мове працавала 98 гурткоў, у якіх займалася 1.377 выбаршчыкаў. У 91 гуртку заняткі праводзіліся на яўрэйскай мове. Гурткі на роднай мове выбаршчыкаў—на беларускай, польскай, яўрэйскай, рускай—працавалі ў Беластоку, Ломжы, Валкавыску, Граеве і ва ўсіх астатніх раёнах.

Праўдзівая большэвіцкая агітацыя мела вялікі поспех сярод выбаршчыкаў. На заняткі прыходзіла па 50—70, а то нават і 100 чалавек. Выключна цікава, арганізавана і жыва праходзілі заняткі ў гуртку агітатара Іосіфа Внароўскага ў Лапскім раёне, Цырульніцкага ў Гродне, Скуратовіч, Рубінштэйн, Астралогавай—у Беластоку і т. д. Агітатары старанна і ўсебакова рыхтаваліся да заняткаў пры дапамозе кіраўнікоў агіткалектываў. Партарганізацыі аказвалі агітатарам канкрэтную дапамогу, кіравалі іх практычнай работай.

Гутаркі праводзіліся аб Сталінскай Канстытуцыі, аб выбарчым законе. Агітатары расказвалі сваім выбаршчыкам аб ваенных падзеях на Захадзе, аб вялікіх унутраных і знешніх перамогах нашай соцыялістычнай радзімы. Яны шырока скарыстоўвалі факты з мясцовага жыцця, прыводзілі кантрасты ў параўнанні жыцця працоўных пры капіталізме і пры совецкай уладзе. Энтузіясты-агітатары не лічыліся ні з чым, а імкнуліся да аднаго—усіх выбаршчыкаў ахапіць сваёй дзейснай большэвіцкай агітацыяй. І гэта было дасягнута. Большэвіцкая праўда дайшла да свядомасці людзей і мела свой поспех.

Выбарчая кампанія закончана. Важнейшай задачай партыйных арганізацый зараз з'яўляецца замацаванне поспехаў агітацыйна-масавай работы, якія дасягнуты ў перыяд выбарчай кампаніі. Аднак з асобных месц паступаюць сігналы аб тым, што некаторыя кіраўнікі партыйных арганізацый і агіткалектываў схільны аслабіць агітацыйна-масавую работу сярод працоўных, адпачыць пасля выбараў. Гэта няправільна! Так могуць думаць толькі людзі, якія не разумеюць значэння большэвіцкай агітацыі. Партыя і таварыш Сталін патрабуюць ад нас, каб агітацыя сярод працоўных вялася штодзённа. Жыццё ні на мінуту не стаіць на месцы. Кожную гадзіну адбываюцца новыя і новыя вялікія падзеі ўнутры нашай краіны і за яе межамі, пра якія мы абавязаны расказаць рабочым, сялянам і ўсім працоўным, дапамагчы ім правільна зразумець падзеі; мы абавязаны расказваць насельніцтву аб тым, што робіцца ў нашым горадзе, у нашым раёне, сельскім Совеце і вёсцы.

Неабходна, каб партыйныя арганізацыі сур'ёзна прадумалі гэтыя пытанні і намецілі канкрэтныя мерапрыемствы па замацаванню поспехаў агітацыйнай работы. Агіткалектывы павінны працаваць так, як яны працавалі і ў перыяд выбараў.

За перыяд выбарчай кампаніі значна палепшылася ў вобласці лекцыйная работа. Выяўлены здольныя лектарскія кадры з мясцовага насельніцтва, ажывілася работа ў дамах соцыялістычнай культуры, клубах, хатах-чытальнях. Сюды прыходзілі рабочыя, сяляне, інтэлігенцыя пачытаць газеты, журналы, паслухаць радыё.

Правільна робяць партыйныя арганізацыі беластоцкага аддзялення Дзяржбанка і 6-га камбіната, якія ўжо намецілі мерапрыемствы па замацаванню поспехаў агітацыйнай работы.

Вынікі работы агітатараў у перыяд выбарчай кампаніі неабходна абмеркаваць у кожнай партыйнай арганізацыі, агіткалектыве і ў райкомах і гаркомах партыі. Неабходна шырока папулярызаваць вопыт работы лепшых агітатараў.

Пры гэтых умовах партыйныя арганізацыі змогуць замацаваць дасягнутыя вялікія поспехі ў агітацыйна-масавай рабоце і дабіцца новых вялікіх перамог.





Уручэнне пасведчанняў аб выбранні дэпутатам Беластоцкага гарадскога Совета: 1) старшыня 35 акруговай камісіі М. Я. Палтурак уручае пасведчанне дэпутату-стаханаўцу 5-га тэкстыльнага камбіната М. І. Бэзу; 2) старшыня 228 акруговай камісіі Л. А. Рыжковіч уручае пасведчанне дэпутату 11-й тэкстыльнай фабрыкі В. С. Паплаўскай.

Фота А. Сапіра.

Не паслабім агітацыйна-масавую работу

(Гутарка з сакратаром партыйнай арганізацыі беластоцкага Дзяржбанка тав. Лінкевічам).

Агіткалектыў пры партарганізацыі Дзяржбанка існуе даўно, яшчэ задоўга да пачатку выбараў у мясцовыя Советы. Агітатары рэгулярна два разы ў месяц праводзілі заняткі на былых выбарчых участках. З пачатку выбарчай кампаніі ў мясцовыя Советы наш агіткалектыў быў прымацаван да 4-га Куйбышэўскага ўчастка, дзе разгарнуў дзейсную работу. Калектыў за гэты час значна ўзрос. Дабавіліся агітатары з ліку мясцовага актыва супрацоўнікаў банка.

У час выбараў агіткалектыў састаяў з 40 чалавек. Усе яны пасур'ёзнаму, па-большэвіцку ўзяліся за правядзенне агітацыйнай работы. Аб гэтым сведчаць вынікі выбараў па 4-му выбарчаму ўчастку, дзе яны праводзілі работу. Усяго праведзена звыш 170 групавых заняткаў і многа індывідуальных гутарак.

Не было ні аднаго дома на нашым участку, дзе не пабываў-бы наш агітатар.

Асабліва праявіла сябе на рабоце агітатар Ольга Скуратовіч, якая праводзіла заняткі па Меблевай вуліцы. Яна абслугоўвала 80 выбаршчыкаў. Заняткі праходзілі цікава і жыва. Усе выбаршчыкі яе гуртка прышлі на ўчастак у дзень галасавання арганізавана і першыя аддалі свае галасы за верных сыноў і дачок нашай радзімы.

Добра арганізавала сваю работу з выбаршчыкамі тав. Рубінштэйн. Усе 30 слухачоў гуртка добра ведалі выбарчы закон і Палажэнне аб выбарах. Яна на польскай мове расказвала выбаршчыкам аб дасягненнях совецкай улады, аб міжнародным становішчы.

Цікава і змястоўна праводзілі гутаркі тт. Рубінштэйн А., Звыжыкоўскі і іншыя. Выбаршчыкі з вялікай увагай слухалі іх.

Агіткалектыў Дзяржбанка замацуе сваю работу на былым выбарчым участку. Мы рашылі не радзей чым адзін раз у дэкаду праводзіць заняткі, і мы гэта выканаем. Набыты вопыт у час выбараў скарыстаем у далейшым.

У знамянальны дзень

З вялікай радасцю ішлі працоўныя сяляне Заблудаўскага раёна да выбарчых урнаў, каб аддаць свае галасы за лепшых сыноў і дачок народа, за непераможны сталінскі блок комуністаў і беспартыйных.

На выбарчы ўчастак № 5 з вёскі Кавалеўцы прышла калона ў 120 чалавек яшчэ задоўга да пачатку галасавання. Над калонай высока развяваліся чырвоныя сцягі, лозунгі. Выбаршчыкі неслі партрэт свайго вызваліцеля — вялікага Сталіна.

«Абавязкова я павінен прагаласаваць першым»,—гаварыў селянін Міхаіл Рэплін. Напярэдадні ён прыехаў з лесу позна вечарам. Спаць не клаўся. Апрануў святочнае адзенне і пайшоў у Рафалаўку на выбарчы ўчастак.

Міхаіл Рэплін галасаваў першым. Ён наогул стараецца ўсюды быць першым. Абавязацельствы перад дзяржавай Міхаіл выканаў хутчэй за ўсіх.

Да памяшкання выбарчага ўчастка пад'язджаюць фурманкі, падыходзяць групамі мужчыны і жанчыны. Ва ўсіх святочны настрой.

У пакоі адпачынку гучаць бадзёрыя песні, іграе музыка. Моладзь танцуе.

Пачалося вялікае свята.

Вёска Дабрынёўка прачнулася рана. Сяляне апранáлі лепшую вопратку, выходзілі на вуліцы, віншавалі адзін другога з радасным святам. У памяшканне выбарчага ўчастка № 4 уваходзяць два мужчыны.

— Мы не спазніліся?

— Не, яшчэ рана, — адказвае старшыня выбарчай камісіі.

Гэта былыя батракі маёнтка Зацішша Казлоўскі і Герман. Яны прышлі на ўчастак у 5 гадзін, каб выканаць свой грамадзянскі доўг. Совецкая ўлада іх зрабіла сапраўднымі людзьмі, і таму яны адчуваюць сёння такую радасць.

Тыльвіцкія сяляне пры панаванні памешчыкаў і капіталістаў адмаўляліся прымаць удзел у выбарах. Іх прымушалі галасаваць за кандыдатаў, якіх яны не ведалі і не бачылі. А цяпер сяляне вёскі Тыльвіца ведаюць сваіх кандыдатаў. Іх кандыдаты—актывісты вёскі, адданыя совецкай уладзе людзі.

Пакой адпачынку. Сюды сабраліся прагаласаваўшыя. Група жанчын, сабраўшыся ў кружок, вядзе ажыўленую гутарку пра гістарычны дзень. Патэфон іграе «Распрагайце, хлопцы, коней». Песню падхапіла моладзь. Адна з жанчын, стаяўшая ў кружку, прытопваючы нагамі, пачала прыпяваць:

«Выбіраем, галасуем,
Бацьку Сталіну дзякуем.
Самых лепшых выбіраем,
Бо ўжо гора мы не знаем.
Усё цяжкае прапала,
Жыццё светлае настала».

Весяліўся народ. У кожнай вёсцы раёна да позняй ночы гучэлі песні радасці, іграла музыка.

Г. Скуцэня.

Замацуем агітацыйную работу на ўчастку

Наш выбарчы ўчастак дабіўся 100-процантнага ўдзелу выбаршчыкаў у галасаванні. Да 1 гадзіны дня прагаласавала 75 процантаў выбаршчыкаў, а да 7 гадзін 40 мінут—усе выбаршчыкі. Перамога гэта не выпадковая. Агіткалектыў 4-га ўчастка Совецкай выбарчай акругі працаваў сур'ёзна, сістэматычна і аддана. Асабліва добра працавалі агітатары 98-й акругі 4-га ўчастка (кіраўнік агіткалектывам тав. Бурштэйн).

Наш агіткалектыў сувязі з выбаршчыкамі не парве, а яшчэ больш замацуе яе. У мопраўскіх ячэйках, якія створаны агітатарамі ва ўсіх 3-х акругах у час выбараў, будзе прадаўжацца палітычна-масавая работа сярод насельніцтва.

Р. Дрэер,
агітатар 4-га ўчастка Совецкай выбарчай акругі г. Беластока.

Апраўдаю вялікае давер'е выбаршчыкаў

З пачуццём глыбокай удзячнасці і вялікай радасці я атрымліваю пасведчанне аб выбранні мяне дэпутатам у Беластоцкі абласны Совет дэпутатаў працоўных. У мінулым батрак, я заўсёды жыў у галечы. Толькі совецкая ўлада і наша большэвіцкая партыя паставілі мяне на ногі. Разам з усім народам вызваленай зямлі я жыву радасна і шчасліва. Чэснай працай на соцыялістычным прадпрыемстве я ўдастоіўся вялікага народнага давер'я. На практычнай рабоце ў далейшым я пастараюся з чэсцю выканаць свае абавязкі перад выбаршчыкамі і радзімай. На заводзе я буду паказваць узоры стаханаўскай працы, актыўна ўдзельнічаць у грамадскім жыцці. Буду вучыцца сам і вучыць другіх людзей соцыялістычным метадам працы. Я памятаю словы таварыша Сталіна, што дэпутат—слуга народа, і буду чэсна служыць народу.

Іван Пятровіч **Чырвонік**,
дэпутат Беластоцкага абласнога Совета, стаханавец цэментнага завода «Роў».

Выдача пасведчанняў аб выбранні ў дэпутаты

СВІСЛАЧ. **(Па тэлефону).** Акруговыя выбарчыя камісіі па выбарах у мясцовыя советы дэпутатаў працоўных Свіслацкага раёна закончылі выдачу пасведчанняў выбраным дэпутатам абласнога, раённага і сельскіх Советаў. Камісіямі па выбарах у абласны Совет выдадзены пасведчанні дэпутатам Ксеніі Касьянаўне Трафімюк, Івану Сільвестравічу Урбіцкаму і Нікалаю Іванавічу Грыбаедаву.

Дэпутатам аб выбранні ў раённы Совет выдадзена 46 пасведчанняў, у сельскія Советы—393.

Д. Казлоў.

Па Совецкай краіне

КАНФЕРЭНЦЫЯ ПІСЬМЕННІКАЎ МАРЫЙСКАЙ АССР

ЙОШКАР-ОЛА. 16 снежня тут закончылася другая рэспубліканская канферэнцыя пісьменнікаў Марыйскай АССР. Марыйскі народ, які не меў у мінулым нават сваёй пісьменнасці, за годы совецкай улады дабіўся велізарных поспехаў у развіцці культуры. Значна акрэпла марыйская літаратура, выраслі кадры пісьменнікаў. За апошнія два годы вышла 11 альманахаў на марыйскай мове, выдана 11 зборнікаў вершаў, 7 п'ес.

МАСТАЦКАЯ СКАРБНІЦА ЛЬВОВА

ЛЬВОЎ. У трох вялікіх будынках горада размясцілася створаная поўгода назад Львоўская дзяржаўная карцінная галярэя. У фондах галярэі—каля 7 тысяч карцін заходнееўрапейскіх, украінскіх і польскіх мастакоў, звыш 4 тысяч графічных твораў і 3.500 мініатур і старажытных ілюстраваных кніжных выданняў. Большасць сабраных каштоўнасцей належала раней прыватным асобам. Цяпер мастацкія скарбніцы сталі народным здабыткам. За поўгода галярэю наведала звыш 45 тысяч чалавек.

ШКОЛЫ СОВЕЦКАГА САХАЛІНА

АЛЕКСАНДРАЎСК - САХАЛІНСКІ. За поўвека царскі ўрад адкрыў на Сахаліне толькі 14 пачатковых школ для дзяцей чыноўнікаў і кулакоў. За 15 год совецкай улады працоўныя Сахаліна атрымалі 110 школ, педагагічнае вучылішча, нафтавы тэхнікум, у якіх навучаецца 20.000 чалавек.



Будынак палаца кнігі па вул. Жорэса ў горадзе Тбілісі.
Фота М. Квірыкашвілі. Фота ТАСС.

У СЯЛЕ ЛЕРМАНТАВА

СЯЛО ЛЕРМАНТАВА (Пензенская вобласць). У 35 кілометрах ад чыгункі раскінулася вялікае сяло Лермантава —былое Тарханы. Тут правёў свае дзіцячыя годы вялікі рускі паэт Лермантаў. Штодзённа ў Дом-музей прыязджаюць экскурсанты. Лермантаўская сядзіба за апошнія годы поўнасцю рэстаўрыравана: у доме, садзе ўсё выглядае так, як было пры жыцці Міхаіла Юр'евіча. Зараз ідзе дзейсная падрыхтоўка да 100-гадовага юбілея з дня пагібелі паэта. У Доме-музеі адкрываецца новы аддзел «Лермантаў і народ».

АЛІМПІЯДЫ ДЗІЦЯЧАЙ ТВОРЧАСЦІ У 1941 ГОДЗЕ

МАСКВА. Больш пяці з паловай мільёнаў школьнікаў удзельнічалі ў гэтым годзе ў аглядах, алімпіядах і выстаўках дзіцячай творчасці. ЦК ВЛКСМ рашыў арганізаваць такія алімпіяды і ў 1941 годзе. Яны будуць праведзены ў абласных, краявых і рэспубліканскіх цэнтрах з 25 чэрвеня па 15 ліпеня.

НОВЫ РЭКОРД МЯДЗВЕДЗЕВА

ЧЭЛЯБІНСК. Буршчык шахты Першамайская Паўднёва-Карабашскага рудаўпраўлення тав. Г. А. Мядзведзеў устанавіў новы ўсесаюзны рэкорд здабычы меднай руды. Працуючы на 6 тэлескопных машынах, ён забурыў у змену 126 шпуроў глыбінёй 2,5 пагонных метра кожны. Пасля адпалкі аказалася, што Мядзведзеў прайшоў 31 пагонны метр, адбіўшы 1.142 тоны руды і выканаўшы зменную норму на 4.000 процантаў. Тав. Мядзведзеў зарабіў за змену 2.920 рублёў.

Перад пачаткам работы былі дакладна выпрабаваны машыны, загатоўлены камплекты бураў з пабедытавымі каронкамі, размечаны напрамкі шнуроў. Механізмы працавалі нармальна. Узнікшыя ў час бурэння перашкоды неадкладна ўстараняліся дзяжурнымі перфаратаршчыкамі і слесарамі.

НА ЗІМОЎКУ Ў ГОРЫ

ФРУНЗЕ. На горных пасбішчах Кіргізіі будзе зімаваць 1.400 тысяч галоў жывёлы. На выпадак бяскорміцы, якая ўзнікае ў рэзультаце галалёду, у гарах загатоўлена сена. На вандраванне ў горы ўходзяць 8 тысяч чабанаў, іх памочнікаў, ветэрынараў, зоатэхнікаў. Яны правядуць зіму ў юртах. У Атбашынскім і Качкорскім раёнах Цэнтральнага Тянь-Шаня для зімоўшчыкаў арганізаваны перасовачныя медыцынскія пункты, ларкі, чырвоныя юрты.

Прафесар М. П. БАСКІН

Сталінскі план індустрыялізацыі

Пятнаццаць год таму назад, 18—31 снежня 1925 года, адбываўся XIV з'езд большэвіцкай партыі. XIV з'езд ВКП(б) быў з'ездам індустрыялізацыі. На гэтым з'ездзе таварышам Сталіным была начэртана велічная праграма соцыялістычнага будаўніцтва ва ўмовах капіталістычнага акружэння. Наперакор ныцікам і малаверам, наперакор злейшым ворагам народа, якія здмаўлялі магчымасць перамогі соцыялістычнага будаўніцтва ў СССР, таварыш Сталін, зыходзячы з ленінскага вучэння, з гранічнай яснасцю даказаў, што совецкая краіна мае **ўсё неабходнае для пабудовы поўнага соцыялістычнага грамадства.**

Аднаўленне народнай гаспадаркі ў гэты перыяд набліжалася к канцу. Прамысловасць і сельская гаспадарка амаль дасягнулі даваеннага ўзроўню. Але гэты ўзровень быў узроўнем адсталай, аграрнай краіны, прамысловасць якой давала толькі трэцюю частку ўсёй прадукцыі. Краіну Советаў неабходна было ператварыць у краіну індустрыяльную, эканамічна незалежную ад капіталістычных краін.

Таварыш Сталін заклікаў совецкі народ да барацьбы за перамаганне тэхніка-эканамічнай адсталасці народнай гаспадаркі, за забеспячэнне гаспадарчай самастойнасці першай у свеце соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян.

«Ператварыць нашу краіну з аграрнай у індустрыяльную,—указаў таварыш Сталін,—здольную вырабляць сваімі ўласнымі сіламі неабходнае абсталяванне, — вось у чым сутнасць, аснова нашай генеральнай лініі».

Трацкісцка-зіноўеўскія вырадкі, выступаючы на з'ездзе ў якасці прамых агентаў капіталістычнага акружэння, прапаноўвалі ператварыць совецкую краіну ў аграрны, земляробчы прыдатак капіталістычнага свету. Яны хацелі пакінуць маладую соцыялістычную рэспубліку бяззбройнай і слабай перад тварам капіталістычнага свету, прапаноўвалі «планы» ператварэння СССР у калонію імперыялістычных дзяржаў. XIV з'езд партыі з абурэннем адкінуў гэтыя здрадніцкія капітулянцкія «планы» ворагаў соцыялізма.

Трацкісцка-зіноўеўскія здраднікі сцвярджалі, што совецкі народ не ў сілах будзе справіцца з цяжкасцямі соцыялістычнай індустрыялізацыі.

У адказ на гэта таварыш Сталін на з'ездзе заявіў:

«Мы не з тых, каго палохаюць цяжкасці. На тое і большэвікі мы, на тое і атрымалі мы ленінскую загартоўку, каб не пазбягаць, а ісці насустрач цяжкасцям і перамагаць іх». Таварыш Сталін даказаў, што нашы цяжкасці — гэта цяжкасці **росту,** цяжкасці няўхільнага прасоўвання наперад. Цяжкасці-ж капіталістычнага грамадства — гэта цяжкасці ўпадку і разлажэння. Нашы цяжкасці самі змяшчаюць у сабе магчымасць іх перамагання.

Соцыялізм, вучыў таварыш Сталін, не можа быць дасягнут шляхам самацёку. Правядзенне соцыялістычнай індустрыялізацыі патрабуе максімальнай арганізаванасці і згуртаванасці мас, бязлітаснай класавай барацьбы з варожымі элементамі. У гэтай барацьбе вялікую ролю адыгрывае большэвіцкая партыя, партыя новага тыпу, партыя, узброеная рэволюцыйнай тэорыяй. Таварыш Сталін абгрунтаваў пяршынствуючае значэнне партыйнага кіраўніцтва ў барацьбе за пабудову соцыялізма. Ён заклікаў працоўных да рэволюцыйнай пільнасці.

У сваім заключным слове таварыш Сталін напомніў дэлегатам з'езда прароцкія словы Леніна: «Расія **нэпаўская** будзе Расіяй соцыялістычнай».

З'езд зацвердзіў сталінскі план соцыялістычнай індустрыялізацыі. У прынятай рэзалюцыі з'езд адзначыў, што «барацьба за перамогу соцыялістычнага будаўніцтва ў СССР з'яўляецца асноўнай задачай нашай партыі».

XIV з'езд партыі арыентыраваўся ў сваіх рашэннях на працоўны энтузіязм мільённых мас працоўных, якія ведалі, што яны ўпершыню ў гісторыі чалавецтва працуюць не на эксплаататараў, а на саміх сябе, на сваё совецкае грамадства. Генеральная лінія партыі абапіралася на глыбокі навуковы аналіз акаляючай рэчаіснасці, яна выцякала з вучэння Леніна—Сталіна аб перамозе соцыялізма ў адной краіне.

Ворагі соцыялістычнай індустрыялізацыі, што выступалі пад флагам так называемай «новай апазіцыі», былі разгромлены. XIV з'езд партыі «...ясна і чотка намеціў шлях далейшай барацьбы за соцыялізм, даў партыі перспектыву перамогі і ўзброіў тым самым пролетарыят нязломнай верай у перамогу соцыялістычнага будаўніцтва». (І. Сталін, «Пытанні ленінізма», выданне 11, стар. 156).

* * *

Заклікаючы да барацьбы за соцыялістычную індустрыялізацыю краіны, XIV з'езд партыі зыходзіў з наяўнасці ў СССР прынцыпова новых крыніц накаплення, немагчымых у краінах капіталізма. У той час як капіталістычная індустрыялізацыя ажыццяўлялася за кошт аграблення каланіяльных і поўкаланіяльных народаў, за кошт кантрыбуцый з пераможаных дзяржаў, соцыялістычная індустрыялізацыя абапіралася на **ўнутраныя рэсурсы.** Совецкая дзяржава, атрымаўшы ў сваё распараджэнне фабрыкі і заводы, якія належалі раней капіталістам, здолела выкарыстаць прыбытак ад дзяржаўных прадпрыемстваў на далейшае расшырэнне прамысловасці. Совецкая ўлада анулíравала царскія даўгі, па якіх у царскі час народ выплачваў іншаземным капіталістам сотні мільёнаў рублёў толькі адных процантаў. Нарэшце, совецкая ўлада, вызваліўшы сялянства ад памешчыцкага гнёту, вызваліла яго разам з тым ад штогоднай уплаты поўмільярда рублёў за арэнду памешчыцкай зямлі. Гэтым самым былі створаны дадатковыя крыніцы для соцыялістычнай індустрыялізацыі.

Сталінскі план індустрыялізацыі пачаў ператварацца ў жыццё. Наша неабсяжная радзіма пакрылася рыштаваннямі соцыялістычнай будоўлі. Стваралася магутная цяжкая індустрыя, магутная абаронная прамысловасць, здольная забяспечыць абарону соцыялістычнай дзяржавы, будаваліся трактарныя заводы, узбройваючыя совецкую вёску перадавой соцыялістычнай тэхнікай. Калі ў 1926—1927 годзе ў справу індустрыялізацыі было ўкладзена каля 1 мільярда рублёў, то праз тры гады ўдалося ўкласці ўжо каля 5 мільярдаў.

Імперыялістычныя ўрады прымалі ўсякія меры, каб сарваць справу індустрыялізацыі Краіны Советаў. Яны наладжвалі правакацыйныя налёты на совецкія паўнамоцныя і гандлёвыя прадстаўніцтвы, забівалі совецкіх прадстаўнікоў, засылалі ў СССР шпіёнаў і дыверсантаў для шкодніцкіх актаў. Але нішто не змагло перашкодзіць пераможнаму ходу соцыялістычнай індустрыялізацыі нашай радзімы. Аказаліся бяссільнымі і трацкісцка-зіноўеўска-бухарынскія здраднікі, якія па заданню замежных разведак узмацнілі сваю падрыўную контррэволюцыйную дзейнасць. Іх гнусныя замыслы, разлічаныя на падрыў дыктатуры пролетарыята, на рэстаўрацыю капіталізма ў нашай краіне, былі раскрыты. Подлыя здраднікі соцыялізма былі разгромлены.

Кіруемы партыяй Леніна — Сталіна совецкі народ дабіўся за мінуўшыя годы сусветна-гістарычных перамог.

Пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна быў распрацован і праведзен у жыццё пяцігадовы план соцыялістычнага будаўніцтва. «Асноўная задача пяцігодкі заключалася ў тым, каб стварыць у нашай краіне такую індустрыю, якая была-б здольна перабудаваць і рэарганізаваць не толькі прамысловасць у цэлым, але і транспарт, але і сельскую гаспадарку—на базе соцыялізма». (Сталін).

Першая сталінская пяцігодка была выканана ў чатыры годы і тры месяцы. Былі занава створаны: чорная металургія, трактарная, авіяцыйная, аўтамабільная і хімічная прамысловасць, станкабудаўнічае і сельскагаспадарчае машынабудаўніцтва. Была створана новая вугальна-металургічная база на Ўсходзе. Была пабудавана Дняпроўская гідра-электрастанцыя, самая магутная гідрастанцыя ў Еўропе, якая ўжо ў 1936 годзе вырабіла звыш 2 мільярдаў кіловат-гадзін электраэнергіі, гэта значыць больш чым выраблялі ўсе электрастанцыі царскай Расіі. СССР высунуўся на адно з першых месц па вытворчасці электраэнергіі. Доля індустрыі ў агульнай прадукцыі СССР вырасла за годы першай пяцігодкі з 48 да 70 процантаў. Совецкая краіна з аграрнай стала індустрыяльнай. Ужо ў выніку першай пяцігодкі капіталістычныя элементы былі «выцеснены з прамысловасці канчаткова і беспаваротна, а соцыялістычная прамысловасць стала адзінай формай індустрыі ў СССР» (Сталін). Другі пяцігадовы план па прамысловасці быў выканан таксама раней тэрміну. СССР ператварыўся ў нязломную крэпасць соцыялізма. У 1937 годзе прадукцыя совецкай прамысловасці больш чым у восем разоў перавысіла даваенны ўзровень. У 1938 годзе даваенны ўзровень быў перавышан ужо больш чым у дзевяць разоў. Распрацаваны ў 1920 годзе пад кіраўніцтвам Леніна план электрыфікацыі народнай гаспадаркі СССР быў намнога перавыканан. Вытворчасць электраэнергіі ў СССР дасягнула ў 1938 годзе 39,6 мільярда кіловат-гадзін, што перавышае больш чым у 20 разоў вытворчасць электраэнергіі ў даваенны час.

Ва ўмовах капіталістычнага акружэння асаблівае значэнне набывала ўмацаванне абароннай магутнасці краіны пераможшага соцыялізма. «Немагчыма адстаяць незалежнасць нашай краіны, не маючы дастатковай прамысловай базы для абароны. Немагчыма стварыць такую прамысловую базу, не маючы вышэйшай тэхнікі ў прамысловасці. Вось для чаго патрэбен нам і вось што дыктуе нам быстры тэмп развіцця індустрыі», — гаварыў таварыш Сталін. Сталінскія пяцігодкі ўмацавалі абаронную магутнасць нашай радзімы. Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот, аснашчоныя самай перадавой тэхнікай у свеце, стаяць грознай, нязломнай сілай на варце свяшчэнных рубяжоў краіны Советаў, забяспечваючы мір і безапаснасць народам СССР.

У выніку ператварэння ў жыццё гістарычных рашэнняў XIV з'езда партыі адсталыя ў мінулым нацыянальныя рэспублікі ператварыліся ў магутныя індустрыяльныя цэнтры. Яркім паказчыкам індустрыяльнага росквіту нацыянальных рэспублік можа служыць Армянская ССР, якая адсвяткавала 24 лістапада 1940 года сваё 20-годдзе. З адсталай, беднай краіны Арменія за годы совецкай улады ператварылася ў індустрыяльную рэспубліку. Прадукцыя буйнай прамысловасці вырасла ў параўнанні з 1913 годам у 22 разы; пабудавана звыш 25 буйнейшых індустрыяльных прадпрыемстваў. У Арменіі зараз выпрацоўваецца электраэнергіі ў 72 разы больш, чым у 1913 годзе. Дасягненні Армянскай ССР не з'яўляюцца выключэннем. Такімі-ж поспехамі гардзяцца і ўсе іншыя совецкія соцыялістычныя рэспублікі.

Паспяховае выкананне сталінскага плана індустрыялізацыі паслужыла асновай для пераводу аднаасобных раздробленых сялянскіх гаспадарак на рэйкі буйной механізіраванай калектыўнай вытворчасці і забяспечыла ў канечным рахунку перамогу калгаснага ладу. На базе суцэльнай калектывізацыі было ліквідавана кулацтва як клас. К канцу 1938 года соцыялістычная прамысловасць дала калгаснай вёсцы 483,5 тысячы трактараў, 153,8 тысячы камбайнаў, каля 200 тысяч аўтамабіляў, сотні тысяч іншых складанейшых сельскагаспадарчых машын. СССР стаў краінай самай перадавой, самай буйнай у свеце механізіраванай сельскай гаспадаркі.

* * *

«Прадукцыйнасць працы,—вучыў Ленін,—гэта, у апошнім рахунку, самае важнае, самае галоўнае для перамогі новага грамадскага ладу». Для перамогі над капіталізмам, указваў таварыш Сталін, мы павінны працаваць па-новаму, мы павінны дабівацца на соцыялістычных прадпрыемствах стражэйшай працоўнай дысцыпліны, найвышэйшых вытворчых паказчыкаў.

Індустрыялізацыя народнай гаспадаркі СССР неразрыўна звязана з гісторыяй смелай і беззаветнай барацьбы працоўных за высокую прадукцыйнасць працы. Ужо ў 1929 годзе пачаўся бурны ўздым соцыялістычнага спаборніцтва. Па ўсёй краіне шырока разгарнулася соцыялістычнае ўдарніцтва. У 1935 годзе ўзнік стаханаўскі рух. Гэты неперамагны рух сучаснасці адкрыў шлях да гіганцкага росту прадукцыйнасці працы. За 1936 год, першы год стаханаўскага руху, прадукцыйнасць працы паднялася на 21 процант у параўнанні з 1935 годам.

Стаханаўскі рух разгортваецца ўшыр і ўглыб. Ён ахапіў ужо трэцюю частку рабочага класа краіны. Паявіліся новыя выдатныя формы стаханаўскага руху ў выглядзе многастаночнага абслугоўвання і сумяшчэння прафесій. У соцыялістычным Данбасе налічваюцца ў вялікай колькасці стаханаўскія лавы і ўчасткі. Стаханавец Крываржжа Алексей Семіволас прымяніў выдатны метад скораснага многазабойнага абсвідроўвання, які значна павышае рост прадукцыйнасці працы.

Сучасная міжнародная абстаноўка, багатая ўсякімі нечаканасцямі, больш чым калі-небудзь дыктуе неабходнасць усямернага ўмацавання гаспадарчай і абароннай магутнасці СССР.

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР «Аб пераходзе на 8-гадзінны рабочы дзень, на сямідзённы рабочы тыдзень і аб забароне самавольнага пакідання рабочымі і служачымі прадпрыемстваў і ўстаноў» з'яўляецца важнейшым мерапрыемствам у барацьбе за соцыялістычную дысцыпліну працы, за ўздым прадукцыйных сіл нашай квітнеючай радзімы. Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР «Аб дзяржаўных працоўных рэзервах СССР» забяспечвае пастаянны прыток на совецкія прадпрыемствы кваліфікаваных кадраў рабочых.

Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік упэўнена ідзе да новага, яшчэ больш высокага ўздыму прадукцыйнасці працы, да новых поспехаў народнай гаспадаркі.

* * *

7 лістапада 1929 года таварыш Сталін пісаў:

«Мы ідзем на ўсіх парах па шляху індустрыялізацыі—да соцыялізма, пакідаючы ззаду нашу векавую «расейскую адсталасць». Мы становімся краінай металічнай, краінай аўтамабілізацыі, краінай трактарызацыі. І калі пасадзім СССР на аўтамабіль, а мужыка на трактар,—няхай папрабуюць даганяць нас шаноўныя капіталісты, якія фанабэрацца сваёй «цывілізацыяй». Мы яшчэ паглядзім, якія з краін можна будзе тады «вызначыць» у адсталыя і якія ў перадавыя» (Сталін, «Пытанні ленінізма», выданне 11-е, стар. 274).

Гэта выдатнае сталінскае прадбачанне цалкам і поўнасцю ажыццявілася. Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік стаў магутнай індустрыяльнай дзяржавай, краінай самай буйнай у свеце механізіраванай сельскай гаспадаркі, краінай перадавой культуры. У СССР ліквідаваны эксплаататарскія класы, знішчана эксплаатацыя чалавека чалавекам, «...у нас ужо ажыццёўлена ў асноўным першая фаза комунізма, соцыялізм». (Сталін).

Капіталістычны свет перажывае зараз нечуваны развал. Другая імперыялістычная вайна разбурае матэрыяльныя і прадукцыйныя сілы грамадства, ваенныя выдаткі ваюючых краін ужо за адзін год імперыялістычнай вайны дасягнулі ад адной трэцяй да паловы ўсяго нацыянальнага даходу.

СССР дзякуючы мудрай знешняй сталінскай палітыцы пазбегнуў жахаў вайны. Расшырыліся граніцы краіны соцыялізма, а капіталістычны свет вымушан быў пацясніцца і адступіць. 193-мільённы совецкі народ, памятаючы сталінскае ўказанне аб капіталістычным акружэнні, няўтомна ўмацоўвае сілу і магутнасць СССР.

Маналітна згуртаваныя вакол большэвіцкай партыі і совецкага ўрада працоўныя масы нашай радзімы дружна змагаюцца за рашэнне гістарычнай задачы, пастаўленай таварышам Сталіным на XVIII з'ездзе партыі:—у бліжэйшы перыяд часу дагнаць і перагнаць галоўныя капіталістычныя краіны і ў эканамічных адносінах. Гэта задача будзе выканана. Парукай гэтаму растучая з кожным днём магутнасць совецкай краіны, воля большэвіцкай партыі, воля мільённых мас совецкага народа.

Пад кіраўніцтвам вялікага Сталіна краіна Советаў ідзе няўхільна наперад, на шляху завяршэння будаўніцтва бяскласавага соцыялістычнага грамадства і паступовага пераходу ад соцыялізма да комунізма.



На здымку: у беластоцкай абласной бібліятэцы імені Горкага.

Фота А. Сапіра.

ПА-БОЛЬШЭВІЦКУ АРГАНІЗУЕМ ЛІКВІДАЦЫЮ НЕПІСЬМЕННАСЦІ І МАЛАПІСЬМЕННАСЦІ

Да ўсіх комсамольскіх арганізацый, комсамольцаў і моладзі, настаўнікаў, вучняў школ старшых класаў і працоўнай інтэлігенцыі Беластоцкай вобласці

У нашай вобласці вельмі многа непісьменных і малапісьменных. Правіцелі былой панскай Польшчы не праяўлялі ніякіх клопатаў аб павышэнні граматнасці і культурнага росту насельніцтва, асабліва на вёсцы. Ва ўсёй Заходняй Беларусі не было ні адной школы дарослых, дзе працоўныя маглі-б атрымаць асвету.

З устанаўленнем совецкай улады ў вобласці адкрыты сотні школ дарослых, дзе сяляне і рабочыя маюць магчымасць ліквідаваць сваю непісьменнасць і малапісьменнасць. Але гэтых школ у нас яшчэ далёка недастаткова.

Абмеркаваўшы пастанову ЦК ЛКСМБ «Аб ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці сярод насельніцтва», мы, комсамольцы пярвічнай арганізацыі калгаса імені Чапаева і вёскі Бацюты разам з несаюзнай моладдзю і інтэлігенцыяй Бацютаўскага сельсовета, Беластоцкага раёна, абавязуемся:

1. Поўнасцю ліквідаваць непісьменнасць сярод насельніцтва на працягу аднаго года, гэта значыць да снежня 1941 года.

2. Да 1 мая 1941 года ліквідаваць непісьменнасць і малапісьменнасць сярод саміх комсамольцаў і моладзі дапрызыўнага ўзросту. Для забеспячэння гэтага мерапрыемства сіламі комсамольцаў абсталяваць 4 лікпункты (у вёсках Бацюты, Нецкі, Толчы, Талапец, у калгасе імені Чапаева).

Абавязуемся разгарнуць соцыялістычнае спаборніцтва сярод культармейцаў на большы ахват непісьменных і малапісьменных індывідуальным абучэннем. Кожнаму культармейцу падрыхтаваць не менш 2-х чалавек. Арганізаваць вылучаным культармейцам належную вучобу, праводзячы метадычныя нарады, кансультацыі і семінары.

У нас у вёсцы яшчэ няма ні адной школы па ліквідацыі непісьменнасці. Комсамольцы бяруць на сябе ініцыятыву стварыць для непісьменных лікпункты ва ўсіх вёсках і арганізаваць нармальную работу гэтых лікпунктаў, абучыць на іх да ўказанага ў даным абавязацельстве тэрміну ўсіх непісьменных.

Уключыўшыся ў работу па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці, мабілізуем усе сілы на дапамогу насельніцтву па магчымасці хутчэй аўладаць граматай на роднай мове.

Наш сельсовет, таксама як і ўсе сельсоветы нашай вобласці, мае магчымасць быць адным з перадавых у раёне па граматнасці. Сваёй работай мы даб'ёмся гэтага.

Сіламі комсамольцаў нашых пярвічных арганізацый ужо праведзен перапіс непісьменнага і малапісьменнага насельніцтва. Па ўсяму сельсовету ўзяты на ўчот грамадзяне, якія падлягаюць ахвату абучэннем. Узяты на ўчот дапрызыўнікі, ужо арганізавана вячэрняя школа, у якой абучаецца 14 чалавек.

У вёсцы Бацюты па ініцыятыве комсамольцаў арганізавана вячэрняя школа павышанага тыпу, якой кіруе настаўнік тав. Сенкевіч. 28 чалавек прыступілі да заняткаў. Вылучаем 70 культармейцаў з комсамольцаў і інтэлігенцыі.

Прымаючы на сябе абавязацельства, звяртаемся да ўсёй абласной комсамольскай арганізацыі і інтэлігенцыі вобласці шырока разгарнуць соцспаборніцтва паміж пярвічнымі комсамольскімі арганізацыямі і культармейцамі за лепшую работу па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці сярод дарослага насельніцтва з тым, каб заваяваць пераходны чырвоны сцяг ЦК ЛКСМБ і Наркамасветы БССР.

Нікалай **Лешчык**—сакратар комсамольскай арганізацыі калгаса імені Чапаева, **Сасноўскі**—загадчык хатай-чытальняй в. Бацюты. Культармейцы: **Стаськоўскі,** Надзя **Прачук,** Надзя **Чэх,** Антон **Прачук,** Анатолій **Пазняк,** **Кіндоркін,** Оля **Бурго,** В. **Вільчэўская,** Нік. **Алексюк,** І. **Рэдута,** **Несцяроўскі,** **Сенкевіч,** **Вільчэўская,** **Лешчынскі,** **Рапава.**

Не паслабляць барацьбы з парушальнікамі працоўнай дысцыпліны

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета аб пераходзе на 8-гадзінны рабочы дзень і сямідзённы рабочы тыдзень і забароне самавольнага пакідання рабочымі і служачымі прадпрыемстваў і ўстаноў мае велізарнае народна-гаспадарчае значэнне для нашай краіны. Ёсць нямала прыкладаў, калі на паасобных прадпрыемствах у выніку дзеяння Ўказа работа значна палепшылася. Узяць, напрыклад, аблмногапромсаюз Беластоцкай вобласці. Гэта сістэма ў чэрвені 1940 г. выпусціла прадукцыі на 3.148 тысяч рублёў, а ў кастрычніку—на 4.758 тысяч рублёў.

Такую-ж карціну можна назіраць і на другіх прадпрыемствах вобласці. Вырас лік перадавых прадпрыемстваў, стаханаўцаў, ударнікаў.

Аднак знаходзяцца яшчэ кіраўнікі, якія лічаць, што імі ўжо ўсё зроблена, і не кантраліруюць выканання Ўказа, не вядуць барацьбы з прагульшчыкамі. Так, на першым камбінаце (дырэктар тав. Егораў) учот яўкі на работу аддан на водкуп табельшчыцы, абавязкі якой ніхто не растлумачыў. У выніку праверкі высветлілася, што дошка ўчоту зусім не закрывалася і за своечасовай яўкай на работу ніхто не сачыў. У спіс для ўчоту яўкі на работу зусім не ўключаны дырэктар, два намеснікі, галоўны інжынер і намеснік галоўнага інжынера. І не дзіва, што ў выніку паслаблення праверкі Ўказа на камбінаце растуць прагулы.

На прадзільна-ткацкай фабрыцы № 12 спазненне рабочых і служачых да 20 мінут зусім не ўлічваецца. Начальнікі цэхаў, якія атрымліваюць спісы спазніўшыхся, ніякіх мер не прымаюць.

Партыйныя і профсаюзныя арганізацыі павінны сістэматычна правяраць выкананне Ўказа. Да кіраўнікоў, якія патураюць прагульшчыкам, трэба прымаць рашучыя меры ўздзеяння. Трэба даваць рашучы адпор усім тым, якія парушаюць законы.

Гаспадарчы год на зыходзе. Задача кожнага прадпрыемства, кіраўніка завода, фабрыкі камбіната, рабочага і служачага—не толькі выканаць, але і перавыканаць гадавы план. Дысцыпліна, парадак, культура ў рабоце—вось тыя ўмовы, якія павінны забяспечыць поспех у выкананні праграмы.

К. Чэрнышоў.

Выканалі фінансавы план

ВАЛКАВЫСК. **(Па тэлефону).** Спаборнічаючы за дастойную сустрэчу дня выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных, многія сельсоветы Валкавыскага раёна дабіліся добрых поспехаў у выкананні фінансавага плана IV квартала. Пяршынства ў спаборніцтве заваяваў Бурнаўскі сельсовет, які выканаў фінансавы план IV квартала на 129 процантаў.

Гудніўскі сельсовет, старшынёй якога з'яўляецца комсамолка Аляксандра Улановіч, выканаў фінплан на 115,2 проціанта. Перавыканалі таксама квартальныя заданні па фінансаваму плану Масеевіцкі, Астроўскі, Роскі, Валпянскі і Рэплянскі сельсоветы.

Д. Казлоў.

Антырэлігійныя гутаркі

Як узнікла рэлігія

Вера ў звышнатуральныя недасягаемыя сілы, якія не падначальваюцца законам прыроды, з'яўляецца асновай усякай рэлігіі, будзь гэта хрысціянства, магаметанства, іудзеізм, або напрыклад, рэлігія дзікароў-аўстралійцаў. Але навука адхіляе існаванне звышнатуральнага свету. Гэта свет уяўляемы, выдуманы, хлуслівы.

Калі - -ж і як узнікла рэлігія і чым тлумачыць яе ўзнікненне?

«Рэлігія, —гаворыць Энгельс,— узнікла ў самыя першабытныя часы, з самых цёмных першабытных уяўленняў людзей аб сваёй уласнай знешняй прыродзе».

У захаваўшыхся стаянках нашых дзікіх першабытных продкаў у іх могілках, у якіх пахаваны памёршыя, мы знаходзім каменную зброю і косці жывёлы. Вывучэнне гэтых слядоў жыцця далёкага мінулага паказвае, што першабытныя людзі, як і сучасныя дзікары, верылі ў розныя прыметы, у закліпанне, у цудадзейнічаючую сілу рэчаў, у загробнае жыццё. Яны былі ўпэўнены, што памёршы будзе працягваць жыць «і ў другім міры», дзе яму спатрэбіцца ўсё, чым ён карыстаўся на зямлі. Таму ў час пахавання разам з памёршым у магілу клалі зброю, рэчы хатняга ўжытку, сжу і іншыя рэчы.

Як-жа старадаўні чалавек прышоў да такіх хлуслівых яўленняў і перакананняў?

Ленін з геніяльнай яскравасцю ўскрывае прычыны, парадзіўшыя рэлігію. «Бяссілле эксплаатуемых класаў у барацьбе з эксплаатарамі, — гаворыць ён,—таксама непазбежна параджае веру ў лепшае загробнае жыццё, як бяссілле дзікара ў барацьбе з прыродай параджае веру ў багоў, чарцей, у цуды і т. д.».

Дзікар не меў ніякага ўяўлення аб законах прыроды, аб навуцы. Ён быў бяссілен перад стыхійнымі з'явамі, голадам, холадам. У сваім жыцці першабытны чалавек на кожным кроку спаткаўся з нечаканасцямі і небяспекамі, якіх не мог ні зразумець, ні знішчыць. Яны ўяўляліся яму звышнатуральнымі, недасягаемымі і страшнымі. І дзікар адносіўся да з'яў прыроды з жахам і павагай.

Першабытны чалавек верыў, што можна ўздзейнічаць на прыроду пры дапамозе шаптунства, усемагчымых цэрамоній, заклінанняў. Паступова выдзяляліся людзі, як быццам-бы «умеючыя» дзейнічаць на духаў, багоў (чараўнікі, шаманы). Затым стаў укараняцца звычай прынясення духам дараў (афяраприношэнне).

З самага пачатку ўзнікнення рэлігія адыгрывала рэакцыйную ролю ў чалавечым грамадстве. Яна перашкаджала авалоданню сіламі прыроды. Замест таго, каб удасканальваць сваю зброю для падначалення прыроды, дзікар рабіў рэлігійныя цэрамоніі, заклінанні, спадзяваючыся гэтым «уміласціваць» сілы прыроды, створаных ім багоў.

Пры пераходзе к больш высокім ступеням грамадскага развіцця мяняліся і формы рэлігіі. Калі грамадства пачало раздзяляцца на класы, на багатых і бедных, на эксплаататараў і эксплаатуемых, тады калдуны і шаманы сталі ператварацца ў «служыцеляў бога» — жрацоў (таксама як і папы), выконваўшых роль «пасрэднікаў» паміж богам і людзьмі. Яны аб'явілі, што ўлада ад бога, і абажаствілі фараонаў, цароў і іншых уладык-прыгнятальнікаў.

Жрацам прыпісвалі цудадзейную сілу. Гэта давала ім магчымасць панаваць над родавымі членамі грамадства. «Служыцелі бога» скарыстоўвалі свой уплыў для ўмацавання ўлады эксплаататараў, для ашуканства народа.

Цяперашнія «жрацы» — папы, ксяндзы і. т. д. —з'яўляюцца першымі памочнікамі капіталістаў, памешчыкаў. Не дарма і зараз у капіталістычных краінах царкоўнікі знаходзяцца на ўтрыманні ў эксплаататараў.

Б. Шарэўская.



Тав. Скаўронская А. І., сакрэтчыца апаратнага цэха 2-га тэкстыльнага камбіната г. Беластока, узнагароджаная наркомам тэкстыльнай прамысловасці СССР значком выдатніка.

На здымку: тав. Скаўронская за работай. Фота А. Сапіра.

ПЛЮШАВАЯ ФАБРЫКА Ў 1941 ГОДЗЕ

Беластоцкая плюшавая фабрыка славіцца сваімі высокасортнымі тканінамі. Выраблямы ёю транспарант з'яўляецца ўнікальным у Совецкім Саюзе артыкулам шаўковага плюша. Ён ідзе на прыгожыя святочныя сукенкі. Высокасортным і ўнікальным з'яўляецца беластоцкі коцік—плюшавая тканіна, якая імітыруе натуральную пушніну. У 1940 годзе плюшавікі дадуць краіне 300 тысяч метраў.

Яшчэ больш творчым і плённым з'яўляецца для калектыва плюшавай фабрыкі надыходзячы новы год. У 1941 годзе прадукцыя плюшавай фабрыкі павінна ўдвоіцца і дасягнуць лічбы 560 тысяч метраў.

Да гэтага часу коцік выраблаўся з прадзільнага тутавага шоўку бурдэ-суа. У 1941 годзе фабрыка павінна асвоіць выпрацоўку коціка з сураўя дубовага шоўкапрада—тусы. Коцік з гэтага новага валакна атрымліваецца багацейшым з цудоўнымі адценнямі і ўпругім доўгавечным ворсам. Фабрыка павінна выпусціць 12 тысяч метраў такога коціка. У будучым вытворчасць гэтай тканіны значна павялічыцца. Дубовыя лясы нашай області і рэспублікі могуць стаць багатымі плантацыямі дзікага шоўкапрада.

У бягучым годзе плюшавікі асвоілі выраб новай тканіны «тыгр». Гэта матэрыял выключна прыгожай расфарбоўкі, падобнай на тыгравую скуру. Ён будзе вырабляцца спецыяльна для абіўкі лімузінаў. Пасланыя ўзоры аўтазаводам імені Сталіна адобраны. У 1941 годзе будзе выраблена 10 тысяч метраў «тыгра».

Нядаўна фабрыка атрымала новы адказны і пачотны заказ — асвоіць выпрацоўку спецыяльнай дэкаратыўнай тканіны для найвялікшага збудавання нашай эпохі — Палаца Советаў. Гэты заказ — вялікая чэсць для беластоцкіх плюшавікоў.

У 1941 годзе на фабрыцы разгорнуцца вялікія работы па рэканструкцыі і ўдасканаленню тэхналагічнага працэса.

А. Бярозка.

ПАРАДЫ АГРАНОМА

ЯК ПАВЯЛІЧЫЦЬ РЭСУРСЫ МЯСЦОВЫХ УГНАЕННЯЎ

Стаханаўцы социялістычнай сельскай гаспадаркі, у мэтах атрымання высокіх ураджаяў, прымяняюць цэлы комплекс мерапрыемстваў, даступных кожнаму калгасу. Асаблівая ўвага звяртаецца імі на максімальнае накапленне, правільнае захоўванне і скарыстанне ўсіх мясцовых угнаенняў: гною, попелу, торфу, кампосту, гноевай жыжы, птушынага памёту і інш.

У калгасах нашай області магчымасці накаплення і скарыстання гэтых угнаенняў вельмі вялікія. Аднак на іх загатоўку, збор і захоўванне не звяртаецца належнай увагі.

Кожнаму соўгасу і калгасу на збор мясцовых угнаенняў трэба звярнуць асаблівую ўвагу. Безпадсцільны гной ад кароў і свіней вельмі вадзяністы. Яго нельга скласці ў правільныя кучы—штабелі цяжка вывазіць на поле і роўнамерна размеркаваць па ўчастку. Найбольш каштоўная састаўная частка гэтага гною (мача) бескарысна губляецца. Такі гной марудна разлагаецца ў глебе пры заворванні і дзейнічае слабей. Акрамя таго колькасць гною значна памяншаецца. Добры гной атрымліваецца тады, калі ёсць дастатковая колькасць падсцілкі.

Пры недахопе саломы добрай падсцілкай з'яўляецца торф. Торф добра ўбірае ў сябе вадкія і газападобныя часткі гною і памяншае страты азота. Для падсцілкі лепш браць з балот верхнія слаі торфу, менш разлажыўшыяся. Але і моцна разлажыўшыйся торф можна скарыстаць на падсцілку, пакрываючы ўсякі раз слой торфу слоем саломы. Ва ўсіх выпадках торф для падсцілкі трэба браць толькі праветраны і прасушаны. Любы торф у вялікай колькасці можна скарыстоўваць для падсцілкі пад гной, для перапраслойвання і пакрыцця гною пры ўкладцы яго ў гноехавальнікі ці ў вялікія правільныя штабелі каля канюшань, скотных двароў або ў полі. У гэтых выпадках торфу можна ўжыць па вазе столькі, колькі ёсць гною, і такім чынам павялічыць колькасць гною ўдвая.

Колькасць і якасць гною залежыць і ад спосабу яго захоўвання. Лепшым спосабам з'яўляецца штабеляванне гною. Заключаецца гэты спосаб ва ўкладцы свежага гною ў гноехавальнікі асобнымі, цесна прылягаючымі адзін да другога штабелямі вышынёй да 2-х метраў з неадкладным і стараннем ушчыльненнем свежага гною пры ўкладцы. Штодзённа атрымліваемы гной павінен укладвацца ў гноехавальнікі і толькі пасля месячнага разлажэння яго трэба вывазіць у поле і адразу укладваць у вялікія, старанна ушчыльненыя штабелі (па 20—40 тон).

Да гэтага часу фекальныя масы ў нас не ўсюды скарыстоўваюцца, хоць яны ў некалькі разоў багацей азотам, чым жывёльныя. І тут прымяненне торфу з'яуляецца лепшым сродкам скарыстання і павелічэння колькасці ўгнаення. Уносячы часцей тарфяную крошку ў скрынкі і выграбныя ямы прыбіральняў, можна накапіць угнаенне, зберагчы найбольш каштоўную вадкую частку іх (мачу). Можна прыгатаваць і торфа-фекалій. Для гэтага на ўзвышаным месцы ўкладваецца слой торфу ў 10—15 сантыметраў, а затым вывозяцца і роўнамерна выліваюцца на кучу фекальныя масы, пасля чаго накладваецца другі слой торфу і т. д., пакуль куча не дасягне 1,5—2 метраў вышыні. Торфу трэба браць 5—7 частак на адну частку фекальных мас.

З усяго сказанага відаць, якія вялікія магчымасці маюць калгасы для павелічэння і паляпшэння якасці розных мясцовых угнаенняў. Нават торф, калі ён блізка знаходзіцца ад палёў, можна скарыстоўваць як угнаенне, вывозячы яго зімой проста на поле. Для гэтага бяруць торф добра разлажыўшыйся і папярэдне праветраны.

Дравесны попел з'яўляецца таксама добрым угнаеннем, якое змяшчае ў лёгкадаступнай форме ўсе спажыўныя матэрыі, акрамя азота. З той прычыны, што ў попеле многа калія (у дравесным да 10 процантаў), ён прылічаецца да калійных угнаенняў.

Тарфяны попел хоць і больш слабае ўгнаенне чым дравесны (змяшчае многа вапны і менш калія), але яго таксама трэба збіраць і скарыстоўваць на ўгнаенне. Тарфяным попелам угнойваюць больш цяжкія, кіслыя глебы.

Птушыны памёт—добрае ўгнаенне, багатае азотам і фосфарнай кіслатой. Памёт збіраецца і прымешваецца да кампостных куч ці захоўваецца асобна.

Кожны калгас і соўгас нашай області мае магчымасць павялічыць рэсурсы мясцовага ўгнаення і гэтым самым дабіцца павышэння ўраджайнасці.

М. Гродскі.

Падрыхтоўка да лыжнага кроса

Комсамольцы Граеўскага раёна горача падтрымліваюць ініцыятыву карэла-фінскіх комсамольцаў аб правядзенні лыжнага кроса ў чэсць XXIII гадавіны Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота. Зварот карэла-фінаў абмяркоўваўся на пасяджэнні ваенна-фізкультурнай камісіі, на якое быў запрошан актыў раённай комсамольскай арганізацыі.

Ваенна-фізкультурная камісія распрацавала канкрэтныя мерапрыемствы па падрыхтоўцы да лыжнага кроса. Намечан лыжны паход комсамольцаў і несаюзнай моладзі раёна правесці ў студзені месяцы. У кросе будзе ўдзельнічаць 200 чалавек.

Зараз у пярвічных комсамольскіх арганізацыях пачалася дзейная падрыхтоўка к лыжнаму пераходу. 20 актывістаў комсамольцаў прыступілі да падрыхтоўкі сваіх уласных лыж. К пачатку кроса кожны ўдзельнік будзе мець свае лыжы. У вёсках, гарадскіх установах праходзяць агульна-комсамольскія сходы, на якіх абмяркоўваюцца пытанні падрыхтоўкі да кроса.

В. Гарбанёў.

Ваеннае абучэнне партактыва ў Чыжаве

Ваенны аддзел Чыжаўскага райкома КП(б)Б арганізаваў ваеннае абучэнне партыйнага актыва. Першыя заняткі былі праведзены 3 снежня. Удзельнікі заняткаў з асаблівай увагай праслухалі лекцыі аб тапаграфіі і аб дысцыплінарным статуце Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

Праграма ваенных заняткаў для партыйнага актыва разлічана на 130 гадзін.

М. Сідарэнка.

Аб гігіене ў хлебных магазінах

Пісьмо ў рэдакцыю

Дрэнна абстаіць справа з гігіенай у хлебных магазінах. Прадаўцы павінны насіць белыя фартухі. Яны і носяць фартухі, але, на жаль, далёка не белыя: на фартуках—тлустыя плямы на шэрым фоне... Рукі прадаўцоў выглядаюць не лепш, бо ў магазінах няма дзе іх памыць.

Зусім дрэнна абстаіць справа з гігіенай пры перавозцы хлеба. У фургоны з хлебам уваходзяць у ботах, хлеб носяць у брудпай вопратцы (фартухі тут сустракаюцца рэдка). Часта здараецца, што буханкі падаюць на тратуар або на падлогу магазіна, адкуль спакойна вандруюць на полку, каб праз некаторы час трапіць у рукі спажыўца.

Трэба, каб горхарчгандаль зацікавіўся гігіенай у хлебных магазінах.

З. Трачэўскі.

Мінная вайна

8 чэрвеня 1855 г. эскадра англа-французскага флота ўвайшла ў Фінскі заліў і прыблізілася да горада Краншгадта. Агледзеўшы ўмацаванні, караблі павярнулі назад, як раптам фрэгат «Мерлін», на якім знаходзіліся адміралы англійскага і французскага флотаў, адчуў моцнае страсенне корпуса. Пачуўся глухі ўзрыў, карабль пакрэніўся на бок, нібы рыхтуючыся перавярнуцца. Не прайшло і некалькі мінут, як паследваў другі ўзрыў, мацней першага. Людзі, ахопленыя панікай, мітусіліся па караблю, шукаючы нябачанага праціўніка. Карабль даў цеч. Неўзабаве паследвалі ўзрывы і пад іншымі караблямі эскадры. Разбурэнні былі настолькі значны, што падарваўшыяся караблі былі адпраўлены ў Англію на рамонт і ўдзелу ў вайне супроць Расіі не прымалі.

Што-ж прадстаўляла сабой першая «адская машына», як называлі яе англічане, выклікаўшая страх у асабістага састава караблёў саюзнага флота? То была міна, вынайдзеная рускім акадэмікам Якобі ў 1840 г. Міна мела форму конуса, зробленага з бляхі, унутр якога закладаўся зарад пораху вагой 5—8 фунтаў з механічным узрывальнікам.

За час з 1840 па 1914 г. мінная загарода падверглася велізарным зменам. Яна тэхнічна была ўдасканалена, вага ўзрыўчатага вешчаства ўзрасла да 130—150 кгр. Міна сістэмы Якобі з зарадам 5—8 фунтаў пораху аказалася цацкай у параўнанні з мінамі 1914—1918 гг.

У годы першай сусветнай вайны ўсімі ваюючымі дзяржавамі было зрасходавана звыш 300 тысяч мін, ад якіх загінула каля 500 вялікіх ваенных караблёў, некалькі сот малых караблёў і каля 600 гандлёвых транспартаў.

У тыя годы для пастаноўкі мін скарыстоўваліся амаль усе класы падводных караблёў, падводныя лодкі, а к канцу вайны і самалёты. Найбольш актыўнымі носьбітамі мін з'яўляліся падводныя лодкі, якія ставілі міны непасрэдна ў гаванях, на фарватэрах, ля берагоў праціўніка, на камунікацыях.

Побач з развіццём і масавым скарыстаннем мін ствараліся і ўдасканальваліся таксама процімінныя сродкі, так званыя тралы, з дапамогай якіх адшукваліся і знішчаліся міны. К канцу вайны англічане вынайшлі параван-ахавальнік. Яго назначэнне—абараняць карабль ад мін. Але параван можа абараняць карабль толькі ад якарных мін. Супроць плаваючых мін і мін магнітных, устаноўленых на дне мора, ён бяссільны.

У цяперашняй імперыялістычнай вайне міны ва ўсіх марскіх флотах ваюючых дзяржаў знайшлі асабліва шырокае прымяненне. Англічане ставяць міны ля сваіх берагоў, каб абараніць іх ад пранікнення нямецкіх падводных лодак. У сваю чаргу немцы, каб падарваць англійскае суднаходства, ставяць міны ля англійскага ўзбярэжжа, ля баз, на комунікацыях. Аб колькасці мін, пастаўленых флотамі ваюючых дзяржаў, няма дакладных даных, як няма дакладных вестак аб ліку караблёў, якія загінулі на мінах. Аднак арыентыровачныя даныя за першыя 8 месяцаў вайны на моры сведчаць, што з ліку загінуўшых 120 баявых караблёў 27 караблёў падарваліся на мінах. За гэты-ж час загінула 497 гандлёвых транспартаў, 169 з іх—ад мін.

У сучаснай вайне флоты ваюючых дзяржаў скарыстоўваюць розныя тыпы мін: якарныя, плаваючыя і донныя.

Якарныя міны складаюцца з корпуса з памешчаным унутры зарадам, з якара, устаноўленага на дне мора, і троса, злучаючага міну з якарам. Вага ўзрыўчатага вешчаства даходзіць да 300 кілограмаў і вышэй. Узрывальнікі якарных мін устроены ў выглядзе гальванаўдарных каўпакоў. Ад удара аб корпус карабля гэтыя каўпакі згінаюцца, шкляная колба, напоўненая хімічнай вадкасцю, разбіваецца, вадкасць пападае на элементы батарэі і ўтварае электрычны ток, які выклікае ўзрыў міннага зарада.

Немцы ў пачатку цяперашняй вайны прымянялі плаваючыя міны шаравай і цыліндрычнай формы з вялікім зарадам. Плаваючая міна пад уплывам ветру або цячэння свабодна перамяшчаецца ў любых напрамках. Пры ўдары аб корпус карабля міна ўзрываецца.

Якарныя міны лёгка вытраліць існуючымі траламі. Што датычыцца плаваючых мін, то іх цяжка вытраўліваць.

Немцы ў сучаснай вайне скарыстоўваюць у вялікай колькасці магнітныя міны, па форме падобныя на авіябомбы. Магнітныя міны скідваюцца з самалёта з дапамогай парашута. Агульная вага такой міны—550 кгр., вага ўзрыўчатага вешчаства—300 кгр. У хвастовой частцы міны змешчана каробка з парашутам; калі міна аддзяляецца ад самалёта, парашут выходзіць з каробкі, раскрываецца, пры ўдары аб ваду аўтаматычна аддзяляецца, і міна апускаецца на дно.

Дзейнічаюць гэтыя міны наступным чынам. Корпус карабля стварае магнітнае поле, якое ўздзейнічае на стрэлку магнітнага прыбора, змешчанага ў міне. Стрэлка прыцягваецца кверху, кранаецца кантакта і замыкае электрычны ланцуг. Далей пры дапамозе рэле і электрычнай батарэі замыкаецца баявы ланцуг, які выклікае ўзрыў.

Немцы вынайшлі магнітную міну, ўсплываючую з дна. Корпус яе зроблен з немагнітнага металу. Калі міна пападае ў сферу дзеяння магнітнага поля карабля, стрэлка магнітнага прыбора, адхіляючыся, замыкае ланцуг і прымушае адпрацаваць сістэму, дазваляючую адчыніцца клапану балона сціснутага паветра, якое знаходзіцца ўнутры міны ў камеры, запоўненай вадой. Па меры паступлення паветра ў камеру вада выцясняецца праз беззваротны клапан. Міна, атрымаўшы станоўчую плывучасць, ўсплывае і, не даходзячы да паверхні на 10—15 метраў, аўтаматычна ўзрываецца.

Англійская магнітная донная міна вынайдзена англічанамі яшчэ ў канцы вайны 1914—1918 гг. Агульная вага яе—713 кгр., вага зарада—360 кгр. Зарад змешчан у гумавым мяшку. Міна прызначалася для пастаноўкі на глыбінях да 25—30 метраў. Пад дзеяннем магнітнага патоку ад корпуса карабля магнітная стрэлка замыкае кантакт баявога ланцуга, выклікаючы ўзрыў. Наколькі паспяхова англічане прымяняюць магнітную донную міну, невядома. Аднак, яна прадаўжае аставацца па ўзбраенні.

Узрыўчатае вешчаство, прымяняемае ў мінах, мае вялікую руйнуючую сілу. Так, напрыклад, пры падрыванні карабля на міне зарад у 250—300 кгр., можа стварыць прабоіну размерам да 100 кв. метраў. З прабоінамі такіх размераў весці барацьбу вадаадліўнымі сродкамі немагчыма. Пры ўзрыве міны пад вадой разбурэнне падводнай часці карабля ўтвараецца сілай імгненна ствараючыхся газаў, даўленне якіх даходзіць да 10.000 кгр. на квадратны сантыметр пры тэмпературы каля 3000—4000° С. Такой сіле даўлення не можа процістаяць ніякая таўшчыня броні, дапускаемая пры караблебудаўніцтве.

Што-ж процістаўляюць караблебудаўнікі мінам?

Пры пабудове вялікіх ваенных караблёў прадугледжваецца стварэнне ваданепранікальных уздоўжных і папярочных адсекаў, карыдораў, некалькіх дпішчаў і інш. Міждонныя прасторы, уздоўжныя карыдоры запаўняюцца палівам, піцявой вадой, тут знаходзяцца «паветраныя карыдоры». Усё гэта робіцца для таго, каб аднесці сілу ўзрыву на больш вялікую адлегласць ад жыццёвых цэнтраў карабля, машынных і кацельных аддзяленняў, артылерыйскіх паграбоў і інш. Наяўнасць такой сістэмы значна павялічвае жывучасць вялікіх баявых караблёў, і для патаплення іх патрабуецца не менш 2—3 узрываў.

Транспарты менш жывучы; пры падрыванні на мінах яны тонуць або, у лепшым выпадку, на доўгі тэрмін выходзяць са строю.

Барацьба з мінамі вельмі складаная, патрабуе многа часу і вялікага тральнага флота. Англійскі флот у мінулую вайну меў у сваім саставе да 1000 тральшчыкаў, з ліку якіх некалькі сот загінула пры падрыванні на мінах.

Шырокі маштаб скарыстання розных узораў мін у сучаснай вайне прымусіў ваюючыя дзяржавы, у тым ліку і Англію, стварыць шматлікі тральны флот. Прызначэнне гэтага флота—вылаўліванне мін, праводка баявых і гандлёвых караблёў за траламі (тралы—провалачныя тросы, падвешаныя да паплаўкоў; тральшчыкі цягнуць за сабой тралы як рыбалоўныя невады), а таксама аперацыі па выяўленню і абясшкоджванню мінных загародак. Плошча воднай паверхні, якая падлягае праверцы траламі, вылічваецца тысячамі квадратных кіламетраў. Натуральна, гэта патрабуе многа часу і сродкаў.

Могуць быць тралы, якія пры сустрэчы з якарнай мінай, перабіваюць трос, які ўтрымлівае міну. У такіх выпадках міна ўсплывае на паверхню і знішчаецца артылерыяй і іншымі сродкамі.

Існуюць розныя сродкі барацьбы з некантактнымі магнітнымі мінамі. Галоўныя з іх: 1. Скажэнне магнітнага поля, ствараемага караблём, шляхам размагнічвання яго да такога стану (стварэнне зваротнага поля), пры якім магнітныя прыборы мін трацяць здольнасць спрацоўваць. 2. Узмацненне магнітнага поля карабля шляхам яго дадатковага намагнічвання, з мэтай выклікаць спрацаванне магнітнага прыбора міны на вялікай адлегласці ад карабля і, значыць, выбух міны на безапаснай адлегласці. 3. Стварэнне спецыяльных буксіруемых тралаў, выклікаючых заўчаснае спрацаванне магнітных прыбораў міны і выбух міны на безапаснай адлегласці ад карабля, буксіруючага такі трал.

Аднак гэтыя вынаходніцтвы не дазваляюць зрабіць вывад, што міна пераможана, бо ўчасткі водных раёнаў могуць засмечвацца рознымі ўзорамі мін, і калі карабль справіцца з магнітнай мінай, то ён можа падарвацца на якарнай або плаваючай мінах. Супроць плаваючых мін яшчэ не вынайдзены надзейныя сродкі.

Мінныя загароды працягваюць аставацца грознай падводнай зброяй.

Капітан-лейтэнант Н. КАЛЯДА.

У АПОШНЮЮ ГАДЗІНУ

ЗВОДКА ІТАЛЬЯНСКАГА КАМАНДАВАННЯ

РЫМ, 18 снежня. (ТАСС). Агенцтва Стэфані перадае наступную зводку італьянскага камандавання: «Учора ў пагранічнай зоне Кірэнаікі непрыяцельскія войскі ў выніку атрыманых імі страт паслабілі свой націск. Нашы самалёты бамбардыравалі англійскія ваенныя караблі, якія наблізіліся да Бардыі. Непрыяцельская знішчальная авіяцыя ўступіла ў бой з нашымі бамбардыроўшчыкамі.

Збіта два англійскіх самалёты. 16 снежня было збіта 5 англійскіх знішчальнікаў. На грэчаскім фронце, у сектары размяшчэння 11-й арміі, адбыліся жорсткія баі. У Эгейскім моры непрыяцельскія самалёты скінулі некалькі бомб на астравы Родас і Стампалія.

Ва Ўсходняй Афрыцы злучэнні італьянскай авіяцыі зрабілі начны налёт на аэрдромы Эрковіца, Сабта і Суміта і пашкодзілі каля 10 непрыяцельскіх самалётаў. Зроблены таксама налёты на чыгуначную станцыю Гедарэфа, абарончыя ўмацаванні Отруб Мон Рэйана, паветраную базу, порт і нафтасховішча Порт-Судана. Чатыры непрыяцельскіх самалёты былі знішчаны на зямлі. Пашкоджаны партовыя збудаванні і нафтасховішчы. У паветраным баі збіта два англійскіх знішчальнік. Адзін з нашых самалётаў не вярнуўся на базу».

ВАЙНА Ў АФРЫЦЫ

ЛОНДАН, 18 снежня. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае з Каіра камюніке англійскага камандавання ваенна-паветраных сіл на Бліжнім Усходзе.

17 снежня, гаворыцца ў камюніке, моцны дождж у Заходняй пустыні перашкаджаў актыўным дзеянням авіяцыі. Тым не менш англійскія самалёты на працягу дня і мінулай ночы рабілі налёты на Бардыю. У выніку бамбардыроўкі ўзнік рад пажараў у раёне размяшчэння воінскага лагера. Пашкоджана вялікая колькасць мотатранспарта. Нашы лётчыкі, якія рабілі разведчыя палёты, бачылі, як непрыяцель адступае па напрамку к Дэрна. Англійскія знішчальнікі падверглі абстрэлу з кулямётаў адступаючыя непрыяцельскія войскі паміж Бардыяй і Тобрукам. Збіта два італьянскіх самалёты, адзін пашкоджан. У час налёту на Дэрна мінулай ноччу ўсе бомбы былі скінуты на аэрадром, аднак дрэнная бачымасць перашкодзіла ўстанавіць памеры прычыненых пашкоджанняў.

У Албаніі англійскія бамбардыроўшчыкі зрабілі налёт на калону мотатранспарта, якая прасоўвалася па дарозе паміж Санты-Кваранта і Балонай.

У Італьянскай Усходняй Афрыцы ў ноч на 16 снежня бамбардыроўцы двойчы падвергся Асаб. Бомбы былі скінуты ў раёне скаплення мотатранспарта. Непрыяцельскія бамбардыроўшчыкі зрабілі налёт на Порт-Судан, прычыніўшы некаторыя пашкоджанні. Адзін непрыяцельскі самалёт пашкоджан. Англійская авіяцыя страт не мае.

АНГЛА-ГЕРМАНСКАЯ ВАЙНА

Германскія паведамленні

БЕРЛІН, 18 снежня. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне паведамляе: «У ноч на 17 снежня германскія бамбардыроўшчыкі правялі паспяховыя налёты на Бірмінгам і Лондан, а таксама на важныя ў ваенных адносінах аб'екты ў Цэнтральнай Англіі. У многіх пунктах былі адзначаны пажары і ўзрывы. Учора ўдзень, з прычыны неспрыяючых метэаралагічных умоў, германская авіяцыя абмежавалася разведчымі палётамі. У Шэфілдзе ўсё яшчэ працягваюцца пажары.

У ноч на 18 снежня некалькі англійскіх самалётаў скінулі бомбы над Паўднёва-Заходнімі раёнамі Германіі: у двух мясцах нязначна пашкоджаны будынкі. У баі збіты тры непрыяцельскіх самалёты. Германская авіяцыя страт не мела».

Англійскія паведамленні

ЛОНДАН, 18 снежня. (ТАСС). Як афіцыяльна паведамляецца, учора ўдзень германская авіяцыя праяўляла над Англіяй вельмі нязначную актыўнасць. Англійскія знішчальнікі збілі адзін германскі бамбардыроўшчык. Увечары авіяцыя праціўніка таксама не прадпрыняла сур'ёзных аперацый. Да позняга вечара ў Лондане не было аб'яўлена ні адной паветранай трывогі.

ЛОНДАН, 18 снежня. (ТАСС). Па афіцыяльнаму паведамленню, у лістападзе ў Англіі, у выніку паветраных бамбардыровак, было забіта 4.588 і ранена 6.202 чалавекі.

ЛОНДАН, 18 снежня. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, у ноч на 18 снежня, не гледзячы на неспрыяючыя метэаралагічныя ўмовы, невялікія злучэнні англійскіх самалётаў падверглі бамбардыроўцы рад аб'ектаў у Паўднёва-Заходняй Германіі і на акупіраваным Германіяй узбярэжжы Францыі.

На тэрыторыі Англіі ў ноч на 18 снежня не паяўляўся ні адзін германскі самалёт. Другі раз з пачатку інтэнсіўных бамбардыровак Англіі міністэрства авіяцыі паведаміла ў сваім камюніке, што «нічога істотнага не адбылося».

ІТАЛА-ГРЭЧАСКАЯ ВАЙНА

АФІНЫ, 18 снежня. (ТАСС). Як афіцыяльна паведамляецца, учора ў выніку грэчаскага націску, праціўнік, панёсшы страты, адступіў да Клісуры, дзе ўзніклі пажары.



На астатніх участках фронта аперацыі развіваюцца таксама паспяхова.

Грэкамі захоплены палонныя і многа ваеннай маёмасці.

НЬЮ-ЙОРК, 18 снежня. (ТАСС). Паводле паведамленняў амерыканскага друку, грэчаскія самалёты бамбардыравалі італьянскія войскі, якія сканцэнтрываліся ва ўшчэллях гор на паўночным фронце. Адна бомба ўпала на склад боепрыпасаў. Пры ўзрыве забіта многа італьянцаў.

Паводле заявы прадстаўніка ўрада, грэкі занялі важныя ўзмоцненыя пазіцыі ў паўночным сектары фронта.

Грэчаская артылерыя інтэнсіўна абстрэльвае заліў Палермо. Італьянцы аказваюць на ўзбярэжжы моцнае супраціўленне.

Італьянская артылерыя, якая ўстаноўлена на вышынях паблізу Тэпелене, перашкаджаючы грэчаскаму прасоўванню на поўнач, абстрэльвае дарогу паміж Тэпелене і Аргіракастронам. Грэкі ўтрымліваюць усе ўзмоцненыя пазіцыі па абодвух баках ракі Дрын на поўдзень ад Тэпелене.

Італьянцы аказваюць адважнае супраціўленне спробам грэкаў заняць Клісуру. Горад знаходзіцца пад моцным артылерыйскім абстрэлам. Ва ўсходняй частцы яго ўзніклі пажары.

Грэкі занялі пункт Грабоска ў гарах Осум, узяўшы ў палон 5 італьянскіх афіцэраў і 300 салдат. Захоплены таксама тры палявых гарматы і 9 кулямётаў. Правае крыло грэчаскай арміі дасягнула гор Сіке.

Грэкі прасунуліся на дзве мілі ад Тэпелене па дарозе Тэпелене—Валона.

ВАЕННЫЯ СУТЫЧКІ ПАМІЖ ТАІ І ФРАНЦУЗСКІМ ІНДА-КІТАЕМ

НЬЮ-ЙОРК, 18 снежня. (ТАСС). Як перадае ханойскі карэспандэнт агенцтва Юнайтэд Прэс, афіцыяльна аб'яўлена, што французскія самалёты бамбардыравалі ўчора паветраныя базы Таі, у якасці адказнай меры за налёты авіяцыі Таі на гарады французскага Інда-Кітая 16 снежня. Самалёты Таі бамбардыравалі горад В'ен-Цьян. Урон нязначны.

ХАЛАДЫ Ў ШАНХАІ

НЬЮ-ЙОРК, 18 снежня. (ТАСС). Агенцтва Асошыэйтэд Прэс паведамляе, што ў сувязі з наступіўшымі моцнымі халадамі ў Шанхаі памёрла мноства бяздомных жабракоў. На працягу гэтага года, заяўляе агенцтва, па вуліцах Шанхая было падабрана 29 тысяч трупаў замёрзшых людзей, у тым ліку звыш 20 тысяч дзяцей.

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў ЗАХОДНЯЙ ПУСТЫНІ

ЛОНДАН, 17 снежня. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае з Каіра камюніке англійскага камандавання ваенна-паветраных сіл на Бліжнім Усходзе: 16 снежня англійскія бамбардыроўшчыкі падверглі бамбардыроўцы непрыяцельскія аэрадромы, размешчаныя паміж Тобрукам і Бардыяй. Асабліва моцнай бамбардыроўцы падверглася Бардыя, дзе скінута звыш 12 тон бомб. Англійская авіяцыя зрабіла таксама налёты на Тобрук, Бомба, Дэрна, Эль-Эдэм, Эль-Губі і Эль-Газала.

Далей агенцтва Рэйтэр перадае камюніке англійскага камандавання наземных сіл на Бліжнім Усходзе. У сувязі з прыбыццём новых, свежых падмацаванняў, гаворыцца ў камюніке, англійскія войскі ўзмацнілі даўленне на праціўніка на лівійскай граніцы. Акрамя захвату 16 снежня Солума і форта Капуцо, захоплена яшчэ 3 непрыяцельскіх форты на лівійскай граніцы, а іменна: Сідзі-Омар, Мусаід і Шэфрэзем. Ваенныя дзеянні працягваюцца ў раёне Бардыі, дзе даўленне з боку англійскіх войск узмацняецца. Мінулай ноччу аўстралійскія войскі з поспехам атакавалі непрыяцельскую калону, захапіўшы транспарт, які следваў за калонай, і гарматы. У Кеніі працягваюць аперацыі патрульныя часці. На фронце ў Судане становішча без змяненняў.

—o—

БАМБАРДЫРОЎКА ДУРАЦО

АФІНЫ, 17 снежня. (ТАСС). Грэчаскае тэлеграфнае агенцтва перадае камюніке камандавання англійскіх ваенна-паветраных сіл Грэцыі. У камюніке гаворыцца, што ўчора англійская авіяцыя, паміма іншых аб'ектаў, падвергла бамбардыроўцы порт Дурацо. Пашкоджанні нанесены докам, дзе былі заўважаны моцныя ўзрывы. Калі англійскія самалёты вярталіся назад, яны бачылі вялікі пажар у раёне парта.

—o—

АНГЛІЯ ЗВЯРНУЛАСЯ ЗА ФІНАНСАВАЙ ДАПАМОГАЙ У ЗША

НЬЮ-ЙОРК, 17 снежня. (ТАСС). Як перадае агенцтва Асошыэйтэд Прэс з Вашынгтона, высокапастаўлены афіцыяльны прадстаўнік заявіў, што Англія афіцыяльна звярнулася да амерыканскага ўрада за фінансавай дапамогай. Указаны прадстаўнік, аднак, не паведаміў падрабязнасцей.

—o—

ПАВЕДАМЛЕННЕ ЮНАЙТЭД ПРЭС АБ ВЫЗВАЛЕННІ ЛАВАЛЯ З-ПАД АРЫШТУ

НЬЮ-ЙОРК, 17 снежня. (ТАСС). Паводле паведамлення карэспандэнта агенцтва Юнайтэд Прэс з Вішы, Лаваль вызвален з-пад арышту.

Як паведамляе карэспандэнт агенцтва Асошыэйтэд Прэс з Вішы, прыбыўшы туды ўпаўнаважаны германскага міністэрства замежных спраў пры галоўнакамандуючым германскімі войскамі ва Францыі Абец меў паўтарагадзінную гутарку з Петэнам. Сёння ў канцы дня ён будзе мець гутарку з Лавалем.



Сцэна з трэцяга акта «Аптымістычнай трагедыі». У ролі Сіплага— артыст В. Сташэўскі, у ролі Вайнонена — артыст Я. Вашчэровіч.

Фота А. Сапіра.

Вялікі поспех „Аптымістычнай трагедыі“

Апошняя пастаноўка Беластоцкага польскага тэатра «Аптымістычная трагедыя» Вішнеўскага карыстаецца выключным поспехам сярод працоўных Беластока.

На адбыўшыхся за час ад 4 да 18 снежня 12 спектаклях прысутнічала каля 10 тысяч чалавек, з іх каля 4 тысяч рабочых, служачых, вучняў прышлі ў тэатр арганізаванымі культпаходамі.

У АБЛАСНЫМ ШТАБЕ ПА ПРАВЯДЗЕННЮ ПЕШАГА ПЕРАХОДУ КОМСАМОЛЬЦАЎ

Абласны штаб па правядзенню 22 снежня пешага пераходу комсамольцаў і несаюзнай моладзі вобласці абмеркаваў пытанне гатоўнасці гаркомаў і райкомаў комсамола да ўдзелу ў пераходзе.

Адзначана, што многія райкомы слаба разгарнулі падрыхтоўчую работу, не арганізоўваюць трэніровачныя пераходы, не прымаюць мер да забеспячэння ўдзельнікаў процівагазамі. (Дамброва, Скідэль, Кольна, Едвабна і іншыя).

Пры пераходзе абавязкова будуць захоўвацца наступныя нормы і правілы:

Дыстанцыя не менш як у 15 кіламетраў для мужчын і 7 кілометраў для жанчын павінна быць пройдзена—палова ў адзін бок і другая палова назад—па незнаёмай дарозе і перасечанай мясцовасці. Удзельнікі будуць праходзіць «заражоную паласу» у процівагазах. Адпраўляць кожную каманду павінны раздзельна, з інтэрваламі. Кожны камандзір атрада дзейнічае самастойна, маючы на руках карту. Збор каманд назначыць на 2 тэрміны, напрыклад, на 8 і 10 гадзін раніцы, каб пазбегнуць лішняй траты часу пры адпраўцы каманд.

Для большага прыцягнення моладзі да ўдзелу ў пераходзе, жывучыя далёка ад раённага цэнтра старт робяць у трох пунктах (раённы цэнтр і мястэчкі «А» і «Б»), куды прыцягнуць моладзь прылягаючых сяленняў.

У выпадку недахопу санітарных сумак для кожнай каманды забяспечыць каманды індывідуальнымі пакетамі. Арганізаваць медыцынскае абслугоўванне. Каля галоўных пунктаў (лес, вёска, брод) расставіць кантрольныя пасты.

Абласны штаб прапануе гарадскім і раённым штабам па пешаму пераходу комсамольцаў далажыць 19 снежня аб гатоўнасці да паходу і колькасці ўдзельнікаў.

Д. Вульфін,
старшыня абласнога штаба па правядзенню пераходу.

Школы Аўгустоўскага раёна

На тэрыторыі Аўгустоўскага раёна ў мінулым было 45 школ (у тым ліку толькі адна сярэдняя) з 115 настаўнікамі. У школах навучалася 5.827 дзяцей.

Зараз у раёне налічваецца 60 школ, з іх 2 сярэдніх і 12 няпоўных сярэдніх, у якіх працуе 217 настаўнікаў. Колькасць вучняў узрасла да 6.800.

Л. К.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

20-га снежня 1940 года, у 8 гадзін вечара, у памяшканні Дома партыйнай асветы адбудзецца агульнагарадскі сход комсамольскага актыва.

Уваход па комсамольскіх білетах.

Гарком ЛКСМБ.

Адказны рэдактар **Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.**

Адрас рэдакцыі: БССР, г. Беласток, будынак аблвыканкома. Тэлефоны: адказнага рэдактара — 17-62, адказнага сакратара — 49, аддзелаў прапаганды і партыйнага — 16-10, эканамічнага аддзела — праз камутатар аблвыканкома, № 23, аддзел пісем—праз камутатар аблвыканкома, № 22. Выдавецтва і бухгалтэрыя — 14-32.

УВ—133. Тыраж 12.000 экз. Друкарня Беластокдруку